Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за сакавік 2016 г.

## Мерапрыемствы да Міжнароднага жаночага Дню

**4 сакавіка**

Ва УА "Кобрынскі палітэхнічны каледж" адбылося слайд – шоу аматарскага клуба "Время и ты» "И словом, и кистью, и звуком". Мультымедыйная прэзентацыя "Імя Жанчыны славім у вяках!" пазнаёміла ўдзельнікаў пасяджэння з цікавымі біяграфічнымі звесткамі з жыцця знакамітых жанчын. Навучэнцы каледжа прынялі актыўны ўдзел у прапануемай віктарыне. Пераможцы атрымалі прызы.

ЦБ, 28 чал.

**6 сакавіка**

Адбылося выступленне літаратурна – паэтычнай групы "Ветразь" са святочнай праграмай "Жаночае свята – прыкмета Вясны!" На працягу праграмы гучалі вершы класікаў беларускай літаратуры, песні ў выкананні ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці, прысутныя прагледзелі музычныя відэакліпы, удзельнічалі ў віктарыне "Кто самая – самая", складалі святочную "Азбуку прыемных слоў".

Арэхаўская СБ, 19 чал.

**6 сакавіка**

Гадзіна паэзіі "Свята самых мілых дам – бабуль, сястрычак, мам" прайшла ў Лукскай інтэграванай бібліятэцы. На свята сабраліся дзеці разам са сваімі матулямі і бабулямі. Дзеці чыталі вершы, спявалі песні. Прадставілі на выстаўку свае малюнкі - "Мама мілая мая".

Лукская СБ, 30 чал.

**11 сакавіка**

Гарадзецкая сельская бібліятэка сумесна з клубам правялі вечар – пасвяшчэнне “Я веру, што ўсе жанчыны прыгожыя”. У выкананні ўдзельнікаў літаратурна – паэтычнай групы “Натхненне” прагучалі вершы і віншаванні ў гонар свята.
З гледачамі праводзіліся конкурсы і віктарыны, жартоўныя апытанні “Калі б жанчыны правілі мірам…”, тэсты “Независимы ли Вы?”. Прапанавана кніжна – ілюстрацыйная выстава “Женщина - сосуд без дна…”

Гарадзецкая СБ, 23 чал.

## Мерапрыемствы да Дня Канстытуцыі

**13 сакавіка**

Гульня – віктарына “По лабиринтам права”. Вучням старэйшых класаў паведамілі пра гісторыю стварэння Канстытуцыі, пазнаёмілі з яе структурай. Прадэманстравана прэзентацыя “Галоўны закон краіны”, з якой школьнікі даведаліся аб асноўных правах і абавязках грамадзян РБ. Прапанавана выстава “Дзецям – пра Канстытуцыю краіны”, на якой былі прадстаўлены выданні Канстытуцыі РБ. Удзельнікі актыўна адказвалі на пытанні прававой віктарыны.

Стрыгаўская СБ, 16 чал.

## Мерапрыемствы да Году культуры, 120-годдзю К. Крапівы

**3 сакавіка**

Хідрынская публічная бібліятэка сумесна з Цэнтрам культуры і вольнага часу і філіялам музычнай школы правялі тэматычны вечар, прысвечаны Міжнароднаму дню роднай мовы "Скарбніца мудрасці беларускай". У час вечара адбылася мультымедыйная прэзентацыя, літаратурна-музычная кампазіцыя “Беларускай мовы рысы непаўторныя”. Дзеці рознага ўзросту ўдзельнічалі ў інтэлектуальных гульнях.

Кніжная выстава "Вітае кніжка беларуская" пазнаёміла вучняў з беларускімі пісьменнікамі-юбілярамі 2016 года.

Хідрынская СБ, 29 чал.

**4 сакавіка**

Да юбілею Кандрата Крапівы ў Дзівінскай бібліятэцы адбылася літаратурна - музычная кампазіцыя "Народ з яго зрадніўся смехам". У рамках мерапрыемства праведзена прэзентацыя "Я - пякучка-крапіва!". З задавальненнем дзеці паглядзелі тэатралізаваную сцэнку "Дзед і Баба", прынялі ўдзел у конкурсе малюнкаў "Смяемся, малюем, ствараем...".

Дзівінская СБ, 31 чал.

**4 сакавіка**

У Арэхаўскай публічнай бібліятэцы адбылося выступленне літаратурна-паэтычнай групы "Ветразь", прысвечанае 120 - годдзю з дня нараджэння К. Крапівы "Дзіўная зорка байкі беларускай". Прысутныя пазнаёміліся з гісторыяй узнікнення і развіцця байкі, творчасцю Кандрата Крапівы, творчасцю іншых беларускіх байкапісцаў. Увазе гледачоў прадстаўлены відэаролік аб творчасці Кандрата Крапівы, тэатралізацыя вядомых баек пісьменніка і чытанне баек удзельнікамі літаратурна–паэтычнай группы.

Арэхаўская СБ, 30 чал.

**5 сакавіка**

На выступленне літаратурна-паэтычнай групы Лукскай бібліятэкі "Патрыярх беларускай сатыры", прысвечанае 120-годдзю з дня нараджэння К. Крапівы, сабраліся вучні старэйшых класаў. Прысутныя пазнаёміліся з творчасцю пісьменніка. Моладзь мела магчымасць паслухаць удзельнікаў літаратурна-паэтычнай групы і самастойна прачытаць творы байкапісца. Да мерапрыемства падрыхтаваны кніжная выстава і відэапрэзентацыя.

Лукская СБ, 25 чал.

**5 сакавіка**

У Навасёлкаўскай публічнай бібліятэцы прайшло выступленне літаратурна-паэтычнай групы, прысвечанае 120-годдзю Кандрата Крапівы "Дзіўная зорка байкі беларускай". Прысутныя пазнаёміліся з гісторыяй беларускай байкі, з жыццёвым і творчым шляхам К. Крапівы. Прапанавана відэапрэзентацыя і кніжная выстава. Гучалі байкі Якуба Коласа, Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Кандрата Крапівы і другіх пісьменнікаў.

Навасёлкаўская СБ, 40 чал.

**9 сакавіка**

У Батчынскай бібліятэцы праведзена літаратурная гадзіна "Як жыць – дык жыць для Беларусі…", прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння Кандрата Крапівы. У ходзе мерапрыемства прысутныя пазнаёміліся з біяграфіяй і творчым шляхам сатырыка, чыталі байкі. У падарунак вучням бібліятэкар падрыхтавала буклеты да юбілею сатырыка. Увазе гледачоў прадстаўлена відэапрэзентацыя "Патрыярх беларускай сатыры".

Батчынская бібліятэка, 25 чал.

**16 сакавіка**

Літаратурна – музычная кампазіцыя "Культура спасёт мир" адбылася ў Акцябрскай сельскай бібліятэцы. У выкананні вучняў школы прагучалі песні, прыпеўкі, вершы. Па байкам Кандрата Крапівы паказаны сцэнкі. Для прысутных прапанавана кніжная выстава.

Акцябрская СБ, 40 чал.

**18 сакавіка**

У зале Хідрынскага СДК адбылося выступленне літаратурна – паэтычнай групы. Мерапрыемстыва прайшло у форме мультымедыйнага вечара – партрэта К. Крапівы да яго 120 – г. з дня нараджэння. Для гледачоў прапанавана прэзентацыя кніжнай выставы па творчасці славутага байкапісца, мультымедыйнае падарожжа па жыцці і творчасці К. Крапівы. Праведзена віктарына па беларускім байкапісцам.

Хідрынская СБ, 35 чал.

**20 сакавіка**

У Кіселявецкай бібліятэцы прайшоў кніжны аўкцыён “Вместе весело читать”. Вучні школы пазнаёміліся з кніжнымі выставамі “Юбіляры 2016”, “Зазірні дружочак у дзіцячы куточак”, “Чароўны свет прыроды”, “Чытаем па - беларуску”. Прадэманстравана відэапрэзентацыя “Юбіляры - 2016”. Дзеці прынялі актыўны ўдзел у віктарыне, пасля атрымалі на памяць кніжныя закладкі.

Кіселявецкая СБ, 10 чал.

**23 сакавіка**

Прайшоў конкурс чытальнікаў “Я на гэтай зямлі нарадзіўся!” Пад час конкурсу бібліятэкар Батчынскай бібліятэкі пазнаёміла прысутных з пісьменнікамі і паэтамі, якія ў гэтым годзе адзначаюць свой юбілей. Удзельнікі пазнаёміліся з выставай “Культура вчера, сегодня, завтра”. У выкананні вучняў прагучалі вершы пра родны край.

Батчынская СБ, 21 чал.

**<u>Мерапрыемствы ў рамках Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі</u>**

**16 сакавіка**

Адкрыццё Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі, казачная вандроўка “В тридесятое царство, в тридесятое государство” прайшло ў Верхалескай бібліятэцы. Удзельнікамі мерапрыемства сталі вучні малодшых класаў. Дзеці пазнаёміліся з гісторыяй узнікнення свята, чыталі вершы і казкі, прынялі ўдзел у віктарыне: “Мы играя проверяем, что умеем и что знаем”, адгадвалі загадкі – падманкі на ўважлівасць. Пераможцы атрымалі льготныя чытацкія білеты..

Верхалеская СБ, 12 чал.

**22 сакавіка**

З 15 па 19 сакавіка ў дзіцячай бібліятэцы праходзіў Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі пад дэвізам “Пусть книги друзьями заходят в ваш дом!” У межах тыдня праведзены Дзень краязнаўства “Кобрыншчына: імгненне гісторыі, імгненні жыцця”; Дзень экалагічных ведаў “Сохранить природу - значит сохранить Родину”; Дзень казкі “Сказка в гости идёт, детям радость несёт”; Дзень майстроў “Добрым людзям на заглядзенне”. Для рабят прадстаўлены электронная прэзентацыя “Кнігі – юбіляры 2016 года”, кніжныя выстаўкі. Адбыўся паказ лялечных спектаклей: “Красная Шапочка”, “Как пчёлка лесным жителям помогла”, праведзены конкурсна – гульнёвая праграма “Книга – тайна, книга клад, книга лучший друг ребят”, турнір знаўцаў “Адкрываем Радзіму – пазнаем сябе”.

ДБ, 169 чал.

**23 сакавіка**

Літаратурнай гульнёй – падарожжам “Чытаюць дзеці на планеце” адкрыўся тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі Гарадзецкай бібліятэкі. Для малодшых наведвальнікаў падрыхтавана кніжная выстава – агляд найбольш чытаемых казак, праведзены літаратурныя віктарыны – “Размінка”, “Пушкінская старонка”, “Казачка заморская”, і некалькі конкурсаў – “Веру – не веру”, “Чароўны малюнак”. Юныя чытачы атрымалі шмат цікавай і карыснай інфармацыі, а таксама салодкія пачастункі.

Гарадзецкая СБ, 21 чал.

**24 сакавіка**

Урачыстае адкрыццё Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі “Книга дарит праздник” прайшло ў Лелікаўскай бібліятэцы.Удзельнікамі мерапрыемства сталі вучні школы. Дзеці пазнаёміліся з гісторыяй свята, удзельнічалі ў гульнёвай праграме, віктарынах “Маскарад казак”, “Угадай героя”,

адгадвалі загадкі. Дадому маленькія чытачы пайшлі з добрым настроем, цікавымі кнігамі і салодкімі прызамі.

Лелікаўская СБ, 15 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**11 сакавіка**

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу арганізаваны камп'ютарны практыкум «Социальные сети, как средство продвижения библиотеки в виртуальном мире». У рамках навучальнага мерапрыемства выступілі спецыялісты цэнтральнай раённай бібліятэкі. Супрацоўнікі сельскіх бібліятэк падзяліліся вопытам выкарыстання магчымасцей сацыяльнай сеткі ў рабоце публічнай бібліятэкі. Адбылася прэзентацыя новых метадычных выданняў аддзела бібліятэчнага маркетынгу ў дапамогу рабоце сельскіх бібліятэк.

ЦБ, 50 чал.

**13 сакавіка**

Свята Масленіцы “Запрашаем на бліны” для жыхароў вёскі Хабовічы адбылося як у даўніну – з танцамі, песнямі, гульнямі. У бібліятэцы для наведвальнікаў арганізавана кніжная выстава “А у нас сегодня Масленица», на якой можна было пазнаёміцца не толькі з гісторыяй свята, традыцыямі, але і фальклорнымі песнямі. Завяршылася свята традыцыйна – спаленнем пудзела Масленіцы.

Хабовіцкая СБ, 35 чал.

**16 сакавіка**

У інфармацыйна - сэрвісным цэнтры бібліятэкі адбылося выступленне літаратурна – паэтычнай групы “Рытм” “Зрабі правільны выбар” па прафілактыцы шкодных звычак. На мерапрыемствы прысутнічалі навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага палітэхнічнага каледжа, якія прынялі актыўны ўдзел у віктарыне “Наше здоровье в наших руках”. Мерапрыемства суправаджалася паказам відэафільмаў аб шкодзе наркотыкаў, курэння, алкаголя.

ЦБ, 58 чал.

**17 сакавіка**

Вяселым і прыгожым атрымалася свята «А мы Масленку сустракаем!», якое арганізавалі работнікі Балоцкай бібліятэкі і клуба. Удзельнікі лялечнага гуртка падрыхтавалі тэатралізавана-гульнёвую праграму «Как Марфушенька Масленицу ждала!» з разнастайнымі гульнямі, конкурсамі, загадкамі. На завяршэнне свята ўсіх гасцей частавалі гарачымі блінамі і духмяным чаем.

Балоцкая СБ, 40 чал.

**18 сакавіка**

У Верхалескай бібліятэцы праведзена эрудыт – лато “Базар галаваломак”. Актыўны ўдзел у гульні прынялі вучні 7 – 9 класаў. З вялікай цікавасцю адказвалі на пытанні, якія задаваліся з розных галін ведаў. У канцы мерапрыемства пераможцы атрымалі памятныя прызы.

Верхалеская СБ, 14 чал.

**21 сакавіка**

У Астроміцкай бібліятэцы аграгарадка прайшло пасяджэнне аматарскага клуба “Юніт” па тэме “Сакрэты рэдагавання тэксту”. Юнакі падзяліліся сваімі навыкамі работы з тэкстам, навучыліся ўстаўляць карцінкі ў тэкст. Выканалі практычную работу “Працуем з тэкстам”, прынялі ўдзел у гульні «Путешествие по клавишам».

Астроміцкая СБ, 10 чал.

## Выдавецкая дзейнасць

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу падрыхтаваны і выдадзены зборнік метадычных рэкамендацый бібліятэкам у дапамогу рабоце з сям’ёй “Возьмите книгу в круг семьи” у рамках рэспубліканскай акцыі "Сямейнае чытанне".

ЦБ

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу падрыхтаваны і выдадзены метадычны дапаможнік у дапамогу рабоце бібліятэк у Год культуры “От культурного проекта – к культурному результату”.

ЦБ

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу падрыхтаваны і выдадзены зборнік сцэнарыяў у дапамогу бібліятэкам рабоце з сям’ёй “Семью сплотить сумеет мудрость книг” у рамках рэспубліканскай акцыі “Сямейнае чытанне”.

ЦБ

Выканаўца Раманюк Н. В.
Тэл. 2 36 81